Т. Б. Закрэўская *(г. Вілейка)*

# САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЕ РАЗВІЦЦЁ ВІЛЕЙСКАГА РАЁНА

Вілейскі раён уваходзіць у пяцёрку буйнейшых раёнаў Мінскай вобласці. У ім налічваецца 407 населеных пунктаў – 23 453 жыхары, горад Вілейка з насельніцтвам 26 797 чалавек (2012 г.). У структуры эканомікі раёна – 10 буйных прамысловых прадпрыемстваў, сярод якіх ААТ «Буддэталі», Вілейская мэблевая фабрыка, Вілейскі камбікормавы завод і г.д. У сістэме адукацыі працуюць 50 устаноў.

Ёсць на тэрыторыі Вілейскага раёна шмат помнікаў архітэктуры сярэдзіны XIX – пачатку XX ст. У 2009 г. з’явіўся ўнікальны мемарыял «Памяці былых вёсак». Такі мемарыял першы і адзіны ў Беларусі, створаны намаганнямі грамадскасці Вілейшчыны ў Год роднай зямлі. Цэнтральнае месца мемарыяла адведзена звычайнай вясковай хаце-прывіду, тут жа калодзеж, масток, што перакінуты праз рэчку, якая ўжо не існуе. Арганічна ўплятаюцца ў комплекс трынаццаць камянёў – па колькасці сельсаветаў, на тэрыторыі якіх калісьці знаходзіліся населеныя пункты, што зніклі. На кожным камяні назвы зніклых вёсак.

Ганарыцца Вілейшчына і выдатнымі землякамі, сярод якіх Піліп Орлік – гетман Правабярэжнай Украіны, аўтар першай украінскай канстытуцыі; Нікадзім Сілівановіч – акадэмік Санкт-Пецярбургскай акадэміі мастацтваў, адзін з аўтараў мазаік Ісаакіеўскага сабора, знакаміты жывапісец канца XIX ст.; Ігнацій Ходзька – класік польскай літаратуры, блізкі сябра А. Міцкевіча, І. Кандрацьеў з вёскі Каловічы – рускі паэт, перакладчык і шэраг іншых навукоўцаў, палітычных дзеячаў, пісьменнікаў, кампазітараў, мастакоў.

Культура Вілейшчыны беражліва захоўвае сваю сама-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бытнасць і непаўторнасць. Галоўнымі арыенцірамі ў сацыякультурнай дзейнасці стала ўдасканаленне тэхналогіі арганізацыі дасугавых праграм з улікам інтарэсаў розных груп насельніцтва і павышэння прэстыжнасці такога адпачынку; выкарыстанне новых цікавых сродкаў, форм і метадаў у арганізацыі канцэртаў і свят; развіццё рэкламнай дзейнасці і творчых сувязей з іншымі ўстановамі і асобамі; плённае супрацоўніцтва з прадпрыемствамі і арганізацыямі раёна: грамадскімі, прафсаюзнымі, дабрачыннымі, рэлігійнымі; развіццё канцэртна-гастрольнай дзейнасці калектываў; паляпшэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы і інш.

Установы культуры Вілейшчыны сёння – не толькі цэнтры зносін і рэалізацыі творчых здольнасцей, але і цэнтры грамадска-патрыятычнага выхавання, прапаганды здаровага ладу жыцця, арганізацыі вольнага часу насельніцтва, зберажэння і развіцця матэрыяльнай і нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Сучаснае грамадства прад’яўляе да ўстановы культуры ўсё больш высокія патрабаванні. Адказваючы на гэты выклік часу, дадзеныя ўстановы пачалі выходзіць за вузкія рамкі адной толькі эстэтычнай, мастацкай культуры і пачалі развіваць культуру ў шырокім сэнсе гэтага слова: культуру як вобраз жыцця чалавека і грамадства.

Забеспячэннем культурных запатрабаванняў насельніцтва Вілейскага раёна займаюцца 33 клубныя ўстановы: дзяржаўная ўстанова «Вілейскі Палац культуры», раённы Дом рамёстваў, Вілейскі цэнтр эстэтычнага выхавання, Каловіцкі Дом майстроў, Вязынскі цэнтр культуры і вольнага часу, Любанскі цэнтр культуры і вольнага часу, 14 сельскіх Дамоў культуры, 12 сельскіх клубаў. Каардынацыйную дзейнасць ажыццяўляе Вілейскі раённы метадычны цэнтр народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы.

Бібліятэчным абслугоўваннем займаецца дзяржаўная ўстанова культуры «Вілейская раённая цэнтральная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліятэка», у складзе якой 38 бібліятэк: цэнтральная бібліятэка, цэнтральная дзіцячая бібліятэка, 5 гарадскіх філіялаў, 30 сельскіх бібліятэк і адна Кавалёўская бібліятэка-клуб.

Дадатковую адукацыю дзеці і моладзь атрымліваюць у дзяржаўнай установе адукацыі «Вілейская дзіцячая школа мастацтваў» і яе філіялах у аграгарадках Любань, Нарач, Ілля, Даўгінава.

Развіццём музейнай справы Вілейшчыны, захаваннем і папулярызацыяй гісторыка-культурнай спадчыны займаецца дзяржаўная ўстанова «Вілейскі краязнаўчы музей», якая заснавана 30 ліпеня 1982 г.; музейны фонд налічвае больш за 25 тыс. адзінак. Музей размяшчаецца ў будынку, які з’яўляецца помнікам грамадзянскай архітэктуры пачатку XX ст. Гісторыя і культура Вілейскага краю паказаны ад старажытных часоў да другой паловы XX ст. Музей захоўвае матэрыялы археалагічных раскопак паселішчаў V–I тысячагоддзя да н.э. і курганных могільнікаў I тысячагоддзя н.э. У музеі экспануюцца: нумізматычная калекцыя, у тым ліку Касцяневіцкі манетны скарб XVII ст., калекцыя дакументаў з царкоўных архіваў XVIII–XX стст., прадметы этнаграфіі – вырабы ганчарства, ткацтва, пляцення, вышыўкі. У экспазіцыі прадстаўлены рарытэты: скарб крамянёвых нажоў эпохі неаліта, скроневыя кольцы, іншыя жаночыя ўпрыгожанні X–XII стст., падзорная труба і чыгуннае ядро напалеонаўскай арміі (часоў вайны 1812 г.), нагрудны знак памочніка вілейскага гарадскога старосты 1892 г., так званы стальны панцыр – дэталь амуніцыі панцырнай роты Чырвонай арміі 1943 г. У 1997 г. паводле пастановы Вілейскага райвыканкама ў асобным будынку адкрыта выставачная зала імя Нікадзіма Сілівановіча. У год музей і залу выстаў наведваюць больш як 20 тыс. чалавек.

Адзін з апошніх помнікаў, які з’явіўся на Вілейшчыне ў 2012 г., – помнік «Усім загінуўшым у вайне 1812 года».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Шмат увагі ўдзяляецца ў раёне навучанню дзяцей і моладзі асновам беларускіх рамёстваў, што падтрымлівае пераемнасць традыцый. З гэтай мэтай арганізаваны гурткі і майстэрні. У іх займаюцца не толькі саломапляценнем, але вывучаюць гісторыю, традыцыі, займаюцца малюнкам, кампазіцыяй, пластыкай, работай з рознымі матэрыяламі, якія спалучаюцца з саломай (папера, дрот, лён, дрэва). Робяць саламяныя маскі да народных свят – Каляд, Вялікадня.

Асаблівае значэнне ў захаванні культуры, таксама ў папулярызацыі і распаўсюджванні лепшых узораў мастацтва беларускага народа маюць установы новага тыпу: Вілейскі раённы Дом рамёстваў і Каловіцкі Дом майстроў. Спектр работы гэтых устаноў даволі шырокі – ад даследаванняў у галіне этналогіі і фальклору да апрабавання атрыманых ведаў у метадычнай і практычнай дзейнасці гурткоў, студый выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Вілейскі раённы Дом рамёстваў працуе на працягу 18 год. Яго дзейнасць накіравана на адраджэнне, захаванне і зберажэнне беларускіх народных традыцый, промыслаў, рамёстваў і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Адным з кірункаў дзейнасці з’яўляецца падтрымка майстроў народнай творчасці раёна, стварэнне ўмоў для развіцця творчага патэнцыялу, магчымасцей для перадачы ведаў, уменняў, навыкаў будучым пакаленням, садзейнічанне росту і прафесіяналізму аматарскіх і творчых аб’яднанняў, прапаганда, развіццё і распаўсюджванне лепшага вопыту ў галіне выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. На базе Дома рамёстваў 9 год існуе аматарскае аб’яднанне «Вытокі», у яго склад уваходзяць 25 майстроў горада і раёна, займаюцца рознымі відамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, народных рамёстваў і промыслаў: разьба па дрэве, вышыўка, саломапляценне, лазапляценне, ручное

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ткацтва, кераміка, бондарства, пчалярства, выцінанка, карункапляценне, бісерапляценне, пляценне лапцей.

У раёне захоўваецца добрая традыцыя праводзіць тэатралізаваныя святы і ўрачыстасці мясцовасці пад назвай «Свята вёскі», якая штогод пашыраецца. Падчас падрыхтоўкі да свят актывізуюцца зборы этнаграфічных матэрыялаў, знаёмствы з майстрамі народнай творчасці, арганізацыя выстаў-продажаў вырабаў народных умельцаў.

Вілейскім раённым метадычным цэнтрам народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы сумесна з Вілейскім гісторыка-краязнаўчым музеем праведзены фальклорныя экспедыцыі па вывучэнні фальклорнай спадчыны Вілейскага раёна. Даследаваны тэрыторыі сельскіх саветаў: Любанскага, Альковіцкага, Рабунскага, Мацькаўскага, Касцяневіцкага. Вынікі экспедыцый запісаны на аўдыё- і відэаносьбіты, якія захоўваюцца ў фондах Вілейскага гісторыка-краязнаўчага музея.

Каля дзвюх з паловай тысячы жыхароў Вілейшчыны займаюцца ў гуртках і клубных аб’яднаннях. Іх кіраўнікі вядуць пастаянны пошук новых форм і метадаў працы, стараюцца далучыць да творчага працэсу ўсё больш і больш людзей, з асаблівай увагай ставяцца да дзяцей і моладзі.

Сямнаццаць калектываў маюць ганаровае званне «народны» ці «ўзорны»: народны аматарскі калектыў «Студыя вілейскіх народных абрадаў і традыцый “Краявід”» Вілейскага краязнаўчага музея; узорны духавы аркестр і народны ансамбль гітарыстаў «Адэліта» Вілейскай дзіцячай школы мастацтваў; народны хор «Любанія» Любанскага цэнтра культуры і вольнага часу; узорны ансамбль народных інструментаў Вязынскага цэнтра культуры і вольнага часу; дзіцячы ўзорны тэатр «Ялінка» і ўзорны клуб-майстэрня (саломапляццене) «Лучынка» Нарачанскага сельскага Дома культуры; народная эстрадная студыя аўтарскай песні «Імпэт» Ільянскага сельскага Дома

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры; народная майстэрня саломапляцення «Крывасельская вясёлка» Крывасельскага сельскага Дома культуры; народныя студыі арыгамі «Чароўны квадрат» і мяккай цацкі «Пушысцікі» Вілейскага цэнтра эстэтычнага выхавання; народны хор ветэранаў, народны тэатр, народны ансамбль «Весялінка», народны вакальны гурт «Сukвецце», узорная эстрадная студыя «Экспромт», народны калектыў аўтарскай песні «Элегія» Вілейскага Палаца культуры.

Вынікам творчай працы работнікаў установ культуры, несумненна, з’яўляюцца культурна-дасугавыя праграмы.

У мэтах актывізацыі творчай ініцыятывы сельскага насельніцтва і стварэння станоўчага іміджа аграгарадкоў спецыялістамі раённага метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы ўведзена ў практыку арганізацыя раённых свят. Такія мерапрыемствы даюць магчымасць актывізаваць розныя слаі насельніцтва, выявіць таленты рэгіёна, для клубных работнікаў яны з’яўляюцца сапраўдным семінарам-вучобой па арганізацыі масавых мерапрыемстваў. Кожны год лепшыя калектывы горада і раёна наведваюць адзін з аграгарадкоў, каб сумеснымі намаганнямі стварыць для яго жыхароў сапраўднае свята.

Шмат цікавых свят-аглядаў ладзіцца на Вілейшчыне: фестываль вясковай культуры «Жыве мая вёска»; агляд аб’яднанняў мастацкай творчасці і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва сярод клубных устаноў Вілейскага раёна «Клубаў нашых хараство – песні, танцы, рамяство…»; прафілактычная акцыя «Быць здаровым – здорава!»; агляд-конкурс «Край Вілейскі – праменьчык Радзімы, ты былінны, таемны і мілы!»; раённы тур абласнога агляду-конкурсу на лепшую пастаноўку сельскіх клубных устаноў «Клуб года»; агляд-конкурс на лепшую арганізацыю культурна-дасугавай дзейнасці для дзяцей і падлеткаў «Выхоўваем асобу творчую»; раённы агляд-конкурс на лепшую арганізацыю

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурна-дасугавых праграм па прапагандзе здаровага ладу жыцця і прафілактыцы асацыяльных паводзін «Надыйшоў час быць здаровымі» (у рамках абласной прафілактычнай акцыі «Здаровая сям'я»).

У 2012 г. упершыню было вырашана правесці раённы фестываль гумару і смеху «Смехатворчасць ды і толькі» на базе аграгарадка Ілья. У мерапрыемстве прынялі ўдзел амаль усе клубныя ўстановы Вілейскага раёна. На імправізаванай сцэнічнай пляцоўцы творчыя калектывы бліскуча жартавалі і дэманстравалі творчыя задумы. Гумар, смех, дасціпныя жарты стваралі добразычлівую атмасферу і патуралі жаданню далучыцца да агульнага свята.

Асноўнай функцыяй бібліятэк была і застаецца інфармацыйная, але гэта не робіць культурна-забаўляльныя функцыі бібліятэк пабочнымі: яны арганічна ўваходзяць у склад бібліятэчнай работы і забяспечваюць паўнату бібліятэчнага асяроддзя.

У пачатку 2000 г. былі распрацаваны тры мэтавыя праграмы: «Жыве народ, пакуль жыве яго нацыянальная памяць», «Зберажом навакольнае асяроддзе разам», «Здаровы лад жыцця – гэта норма», удзельнікамі рэалізацыі якіх сталі ўсе бібліятэкі горада і раёна.

У вельмі цёплай атмасферы ў Вілейскай цэнтральнай раённай бібліятэцы праходзяць сустрэчы з беларускімі пісьменнікамі, як, да прыкладу, з паэтамі Н. Гальпяровічам, В. Жуковічам, Л. Рублеўскай, А. Легастаевай, І. Карнаухавай, М. Башлаковым, М. Шабовічам і паэтам з Вілейшчыны М. Кутасам.

Далучыць да чытання лепшых узораў мастацкай літаратуры ставіць сваёй задачай акцыя «Кнігі, якія мяне ўразілі», арганізаваная Вілейскай цэнтральнай раённай бібліятэкай сумесна з аддзелам ідэалогіі райвыканкама і рэдакцыяй газеты «Шлях перамогі». Мэта акцыі – вы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

светліць кнігі, якія найбольш уразілі, запомніліся, якія карыстаюцца попытам.

Адным з напрамкаў дзейнасці бібліятэк з'яўляецца краязнаўчая работа, якая носіць творчы характар. Супрацоўнікі бібліятэкі прадоўжылі рэалізацыю доўгатэрміновага праекта «Незабыўныя імёны Вілейшчыны».

Добры водгук ад наведвальнікаў Міжнароднай кніжнай ярмаркі атрымала кніжна-ілюстрацыйная выстава «Зямлі Вілейскай прыцягненне» з раздзеламі: «Вілейшчына – наша слава і гонар»; «Музыка – душы акампанемент»; «Галасы Вілейскага краю»; «Дарога да храма – дарога з дарог»; «Мы славім тых, хто след для нас пакінуў»; «Турыстычная Вілейшчына».

«Берегини духовного богатства» – пад такой назвай адбываюцца традыцыйныя сустрэчы з ветэранамі бібліятэчнай справы.

Цэнтральная бібліятэка актыўна займаецца выдавецкай дзейнасцю. Першыя выданні з'явіліся ў 2000 г. Зараз яны прадстаўлены зборнікамі вершаў самадзейных паэтаў, метадычнымі распрацоўкамі, даведнікамі, бібліяграфічнымі паказальнікамі і г.д.

Гэты даслед сведчыць, што ўстановы культуры Вілейшчыны імкнуцца як мага больш рабіць дзеля таго, каб жыццё людзей станавілася больш насычаным і разнастайным, а вольны час цікавым і змястоўным.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ